Мінск, 12 жніўня 2017 года

Ваша Экселенцыя,

Дазвольце павіншаваць Вас з нагоды знамянальнай даты ў гісторыі нашых краін – 25-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Сінгапур.

За мінулы час мы сталі сведкамі росту ўзаемнага гандлёвага абароту, развіцця палітычных і культурных сувязей. Упэўнены, што далейшае ўмацаванне ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Сінгапурам разам з актыўным пашырэннем напрамкаў двухбаковых кантактаў на ўсіх узроўнях будзе і надалей спрыяць сяброўскім адносінам паміж народамі нашых краін.

Прыміце, Ваша Экселенцыя, пажаданні моцнага здароўя і поспехаў у адказнай дзяржаўнай дзейнасці, а таксама запэўненне ў маёй вельмі высокай павазе.

Уладзімір Макей

**Яго Экселенцыі**
**Доктару Вівіану Балакрышнану**
**Міністру Замежных Спраў**
**Рэспублікі Сінгапур**
**Сінгапур**